давали советы. Работы были выполнены на высоком уровне, несмотря на юный возраст читателей.

Во-первых, они помогут понять, насколько успешно прошло изучение предыдущих тем. Во-вторых, будут способствовать творческому развитию детей. В арсенале современных педагогов огромное количество способов развития творческих способностей учеников. Рассмотренные нами творческие задания можно предлагать учащимся на завершающем этапе изучения произведения. Чем богаче творческая обучающая среда, тем легче раскрыть индивидуальные возможности каждого из них с учетом выявленных интересов, склонностей и субъектного опыта ребенка, накопленного им в семье, в общении со сверстниками, обучении, реальном взаимодействии с окружающим миром. Творчество задействует все сферы сознания читателя-школьника, на формирование которого влияют не только знания и практические умения, полученные на уроках русской литературы, но и чувства, интуиция и воображение.

**Библиографический список:**

1. Добротина, И. Н. Читательская грамотность школьников / И. Н. Добротина [и др.]. – М. : Просвещение, 2018. – 144 с.

2. Мишатина, Н. Л. Методика развития читательской грамотности «От текста к смыслу» / Н. Л. Мишатина, И. В. Муштавинская. СПб : КАРО, 2023. – 208 с.

# ПАТРАБАВАННІ ДА СУЧАСНАГА НАСТАЎНІКА ЛІТАРАТУРЫ: З ВОПЫТУ РАБОТЫ

***К. С. Калабук***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – І. М. Мішчанчук, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца патрабаванні да сучаснага настаўніка беларускай літаратуры, вызначаюцца змены ў асэнсаванні асобы педагога ў XXI стагоддзі.

**Ключавыя словы:** настаўнік; ідэал; вучань; педагагічны вопыт.

XXI стагоддзе вылучае новыя тэндэнцыі ў развіцці сучаснага адукацыйнага працэсу. Цяпер настаўнікі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі рыхтуюць не толькі адукаваную асобу, але і крэатыўнага, творчага, усебакова развітага грамадзяніна, які павінен заўсёды імкнуцца да самаразвіцця, удасканалення і самаадукацыі. Таму і настаўнік павінен быць такой самай асобай (поўнай энэргіі, харызмы, таленту і любові да сваёй дысцыпліны), якая нястомна працуе над уласным метадычным патэнцыялам.

Да настаўніка літаратуры заўсёды прад'яўляліся наступныя патрабаванні, многія з якіх не страцілі актуальнасці ў наш час: «быць узорам высокамаральнай асобы; валодаць агульнапрафесійнымі якасцямі (ведаць тэарэтычныя асновы навукі, якая выкладаецца; выкарыстоўваць агульныя метады перадачы ведаў; ведаць і улічваць узроставыя асаблівасці вучняў; цікавіцца і авалодваць новымі тэхналогіямі навучання і інш); адпавядаць вузкаспецыяльным патрабаванням (умець разумець літаратуру і лепшае ў ёй даводзіць да свядомасці школьнікаў, быць асобай творчай, умець арганізаваць самастойную творчую дзейнасць вучняў, валодаць лектарскім майстэрствам, артыстычнымі дадзенымі, умець сфармуляваць сістэму пытанняў, пастаянна знаёміцца з новымі творамі мастацкай літаратуры, бездакорна валодаць вуснай і пісьмовай формамі мовы і інш.)» [3].

Педагогіка на сучасным этапе, які вызначаецца зменамі ў адукацыйнай парадыгме, разглядае навучанне і выхаванне «як працэс, які накіраваны на самаразвіццё асобы вучня, на пашырэнне яго магчымасцей кампетэнтнага выбару свайго жыццёвага шляху. На ўроку праходзіць большая частка школьнага жыцця дзіцяці. І ад таго, як гэта жыццё будзе арганізавана, залежыць поспех навучання і выхавання» [1].

Відавочна, што даць належную адукацыю вучню немагчыма ў тым выпадку, «калі ён гэтага не хоча і не бачыць патрэбы ў набыцці ведаў, таму перад кожным настаўнікам стаіць пытанне: якім павінен быць настаўнік, як вучыць, каб павысіць эфектыўнасць сучаснага ўрока, якія сродкі для гэтага падабраць? Даваць веды – задача складаная. Але яшчэ цяжэй дапамагчы вучням дасягнуць такога ўзроўню, каб яны адчулі сябе творчай, актыўнай і патрэбнай асобай у грамадстве» [1].

Дык якім жа павінен быць сучасны настаўнік, каб вучні кожны раз з вялікім задавальненнем ішлі на яго ўрок, дзе спасцігалі новае, не толькі простае, але і складанае, каб былі не пасіўнымі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу, а актыўнымі «суаўтарамі» траекторыі пошуку нязведанага, цікавага і карыснага матэрыялу, маглі з упэўненасцю сказаць: «я магу, я умею, я зраблю»? Як слушна зазначалі педагогі, «усебаковае развіццё, духоўнае багацце не можа быць дасягнута па прымусу. Сапраўднае духоўнае багацце складаецца тады, калі чалавек сам цягнецца да ведаў, да навукі, да мастацтва» [1].

З мэтай выявіць рысы ідэальнага настаўніка, на базе Мінскага дзяржаўнага каледжа лёгкай прамысловасці і комплекснай лагістыкі і Сярэдняй школы № 213 горада Мінска было праведзена апытванне на тэму «Рысы майго ідэальнага настаўніка». Кожнаму рэспандэнту патрэбна было падкрэсліць рысы, якія па асабістым меркаванні яны лічаць неабходнымі для ідэальнага настаўніка, і тыя рысы, якія, на іх погляд, непажаданыя.

Па выніках даследавання можна зрабіць наступныя вывады: сучасныя вучні ў сваім разуменні добрага настаўніка бачаць філолага, які добра валодае праграмай (100% адказаў), валодае новымі тэхналогіямі правядзення ўрокаў (100% адказаў), можа падтрымаць у складаныя моманты (100% адказаў), надае ўвагу тым вучням, якія не вельмі добра разумеюць тэму (96% адказаў), чалавека з пачуццём гумару (93%) і інтэлігентную асобу (93% адказаў).

З тых рыс, якія непажаданыя для настаўніка, па меркаванні вучняў, выдзяляюцца наступныя: неаб'ектыўны (100% адказаў), не дае шансу выправіць адзнаку (100% адказаў), празмерна строгі (100% адказаў), некампетэнтны (94% адказаў), пагардлівы (94% адказаў), не ўмее зацікавіць вучня (94% адказаў).

Каб вырашыць задачу з выпраўленнем непажаданых для настаўніка рыс, патрэбна актывізаваць пазнавальную дзейнасць школьнікаў, якая забяспечвае іх актыўнае ўключэнне ў адукацыйны працэс у форме сумеснай працы, а таксама актывізацыю пазнавальных здольнасцей школьнікаў, што ў сваю чаргу стане трывалым падмуркам цікавасці да беларускай літаратуры. Практыка (праца настаўнікам беларускай мовы і літаратуры) засведчыла, што самы дзейсны сродак у гэтым кірунку – сумесная, актыўная і творчая праца на ўроку з выкарыстаннем шматлікіх сучасных адукацыйных тэхналогій, камбінаванне розных форм і відаў навучання (індывідуальнай, групавой, калектыўнай і г.д.), а таксама прымянне электронных сродкаў навучання, электронных адукацыйных рэсурсаў і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Менавіта пры дапамозе спалучэння розных метадаў, форм і відаў работы ўрокі беларускай літаратуры становяцца цікавымі для вучняў, поўняцца не толькі багатым вучэбным матэрыялам, але з'яўляюцца асновай для фарміравання ў школьнікаў разнастайных кампетэнцый, якія спатрэбяцца ім у далейшым самастойным жыцці.

Яшчэ ў XVII стагоддзі Я. А. Каменскі ў «Вялікай дыдактыцы» адзначаў: «Правільна вучыць моладзь – гэта не значыць убіваць у галовы сабраную з аўтараў сумесь слоў, выразаў, думак, а гэта значыць раскрываць здольнасць разумець рэчы, каб менавіта з гэтай здольнасці, быццам з жывой крыніцы, пацяклі ручайкі (веды)» [2, с. 81].

Такім чынам, каб зацікавіць вучняў і стаць ідэалам (ці наблізіцца да яго), настаўнік не павінен быць пасіўным пасрэднікам паміж школьнікам і падручнікам (ведамі), а адмысловым майстрам, дарадцам-суразмоўцам, які

накіроўвае школьнікаў да пошуку новых адкрыццяў і ўменне выкарыстоўваць іх на практыцы, а часам – у нестандартнай сітуацыі.

**Бібліяграфічны спіс:**

1. Клаўшчына, Г. І. Апісанне вопыту педагагічнай дзейнасці «Выкарыстанне разнастайных форм і відаў работы на ўроках беларускай мовы як сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў» [Электронны рэсурс] / Г. І. Клаўшчына. – Рэжым доступу: https://infourok.ru/abagulnenne-vopitu-pedagagichnay-dzeynasci-pa-belaruskay-move-vikaristanne-raznastaynih-form-i-vida-raboti-na-rokah-belaruskay-m-3721192.html. – Дата доступу: 10.04.2023.
2. Коменский, Я. А. Педагогическое наследие / Я. А. Коменский [и др.] / сост. В. М. Кларин, А. Н. Джуринский. – М. : Педагогика, 1989 – 416 с.
3. Методыка выкладання беларускай літаратуры [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад.: І. М. Гоўзіч, А. І. Лугоўскі // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/133. – Дата доступу: 13.04.2023.

# ТВОРЧЕСКИЕ ЗАДАНИЯ В ПРОЦЕССЕ ИЗУЧЕНИЯ КОМЕДИИ Н. В. ГОГОЛЯ «РЕВИЗОР»

***В. А. Кузнецова***

*УО «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», г. Минск*

*Научный руководитель — А. И. Гаранина, кандидат педагогических наук, доцент*

**Аннотация.** В статье рассматривается методика обучения учащихся выполнению творческих заданий в процессе изучения комедии Н. В. Гоголя «Ревизор». Экспериментальная работа проводилась в 7 классе на базе Колодищанской средней школы Минского района во время педагогической практики.

**Ключевые слова:** творческие задания; комедия Н. В. Гоголя «Ревизор»; метод творческого чтения; инсценирование; драматические произведения; сочинение-домысливание; творческий пересказ.

В процессе изучения художественного текста в школе важную роль играют творческие задания, так как именно они позволяют заинтересовать читателя-